1. К 130-летнему юбилею со дня рождения первого директора Национальной библиотеки Беларуси Иосифа Бенциановича Симановского [Электронный ресурс]. – Режим доступа: clck.ru/3Bzw4J. – Дата доступа: 25.09.2024.

2. *Симановский, И. Б.* Докладная записка от 26.06.1923 в правление Белорусского университета о необходимости библиотечных курсов. Копия / И. Б. Симановский. – Минск, 1923. – 4 л.

3. *Симановский, И. Б.* Некоторые предложения к работе кафедры и деканата. Резолюция карандашом: «Иосиф Бенцианович! Хорошо бы эти вопросы осв.» / И. Б. Симановский. – Минск, [б. г.]. – 1 с.

4. *Симановский, И. Б.* Отзывы о курсовых работах студентов заочного отделения Государственного педагогического института им. А. М. Горького за 1955 г. / И. Б. Симановский. – Минск, 1955. – 16 с.

5. *Симановский, И. Б.* Планы работы на факультете библиотековедения Минского государственного педагогического института им. А. М. Горького за 50–60-е гг. Отчеты о работе / И. Б. Симановский. – [Б. м., б. г.]. – 48 с.

6. *Симановский, И. Б.* Развитие библиотечного дела в БССР, его итоги и перспективы, к 40-летию Великой Октябрьской социалистической революции / И. Б. Симановский // 40 лет библиотечного строительства в СССР : докл. науч. конф., 23–26 дек. 1957 г. / под ред. Ф. С. Абрикосовой. – М., 1958. – С. 191–286.

7. *Симановский, И. Б.* Рецензии на дипломные работы студентов Минского государственного педагогического института им. А. М. Горького за 1954–1957 гг. / И. Б. Симановский. – [Б. м., б. г.]. – 76 с.

8. *Симановский, И. Б.* Черновые наброски к годовому отчету по библиотечному факультету / И. Б. Симановский. – Минск, 1948. – 1 с.

УДК 343.51:347.951.3(476-25)"18"

**І. Н. Колабава,**

*кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт ультуры і мастацтваў», Мінск, Беларусь*

# ПАДРОБКА РАСІЙСКАЙ МАНЕТЫ Ў ПІШЧАЛАЎСКІМ ТУРЭМНЫМ ЗАМКУ МІНСКА Ў XIX ст.

**Анатацыя.** На прыкладзе архіўных судовых дакументаў разглядаецца праблематыка гісторыі фальшываманецтва на тэрыторыі Беларусі XIX ст. Гістарычныя падзеі і геаграфічнае становішча спрыялі развіццю гэтай з'явы на беларускіх землях. Уваходжанне беларускіх тэрыторый у склад Расійскай імперыі пераарыентавала дзейнасць мясцовых фальсіфікатараў на расійскую манету і папяровыя грашовыя знакі. Унікальным выпадкам стаў двойчы зафіксаваны факт падробкі манет у знакамітым Пішчалаўскім турэмным замку ў Мінску.

**Ключавыя словы:** фальшываманецтва, прылады працы фальшываманетчыка, расійская манета, Пішчалаўскі замак.

**I. Kolabava,**
*PhD in History, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Historical and Cultural Heritage of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk, Belarus*

## FORGERY OF RUSSIAN COIN IN THE PISHCHALAVO PRISON CASTLE OF MINSK IN THE XIX CENTURY

**Abstract.** The article examines the problems of the history of counterfeiting on the territory of Belarus in the 19th century using archived court documents as an example. Historical events and geographical location contributed to the development of this phenomenon in Belarusian lands. The inclusion of Belarusian lands in the Russian Empire reoriented the activities of local counterfeiters to Russian coins and paper money signs. A unique case was the twice-recorded fact of forgery of coins in the famous Pishchalav prison castle in Minsk.
**Keywords:** counterfeiting, counterfeiter's tools, Russian coin, Pishchalav Castle.

Беларускія землі, у сувязі са спрыяючымі ўмовамі (геаграфічнае становішча, гістарычны лёс) былі ў справе еўрапейскага фальшываманецтва ў ліку першых па колькасных і якасных паказчыках.

У архіўных справах можна знайсці значны аб'ём судовых дакументаў і іншых пісьмовых крыніц, якія зафіксавалі практычна ўсе бакі дзейнасці фальшываманетчыкаў на тэрыторыі Беларусі, нават тых, якія супрацоўнічалі з адпаведнымі замежнымі цэнтрамі, падрабляючы ў розныя гістарычныя перыяды як манеты, так і папяровыя грашовыя знакі.

Манетны фонд беларускага насельніцтва ў першай палове XIX ст. уяўляў даволі стракаты набор разнастайных грашовых адзінак замежнай і расійскай вытворчасці.

Расійскі ўрад праводзіў у дачыненні да мясцовай грашовай гаспадаркі даволі лаяльную палітыку, накіраваную на паступовае ўваходжанне беларускіх зямель у склад агульнарасійскага рынку.

Падобная сітуацыя найлепшым чынам спрыяла актыўнай дзейнасці мясцовых фальшываманетчыкаў.

Цікава, што ў матэрыялах судовых устаноў г. Мінска XIX ст. месцам працы фальшываманетчыкаў двойчы становіцца Пішчалаўскі турэмны замак.

Першы выпадак зафіксаваны матэрыяламі Мінскага Галоўнага суда за 1824–1825 гг. і падрабязна разгледжаны ў некалькіх навуковых публікацыях [1]. Сутнасць першага эпізоду з дзейнасці фальшываманетчыкаў зводзіцца не толькі да факту падробкі, але і да апісання працэсу з выкарыстаннем падручнага матэрыялу і самаробных прылад працы.

Другі аналагічны выпадак адбыўся ў Пішчалаўскай вязніцы ў канцы 1860-х гг.

У снежні 1870 г. Мінская крымінальная палата слухала справу па абвінавачанні групы вязняў Мінскага турэмнага замка ў вырабах фальшывых манет.

У матэрыялах следства ўказвалася, што 27 студзеня 1869 г. наглядчыку замка і каравульнаму афіцэру арэстантам Каржанеўскім быў прадстаўлены «свёрток в бумаге и тряпке» з свінцовымі і невядомага сплаву зліткамі. Па яго словах, злiткі належалі арэстантам Ерамееву і двараніну Садоўскаму. Каржанеўскі абвінаваціў іх у вырабе фальшывых манет і назваў шэраг імёнаў вязняў, а таксама і жонку Садоўскага – Моніку Францаву Садоўскую, якія нібыта разам супрацоўнічалі з гэтамі фальшываманетчыкамі [2, арк. 15 адв. – 16, 18–18 адв.]. У Садоўскага нічога падазронага не было знойдзена, але працяг унутранага следства ўсё ж такі даў станоўчыя вынікі.

16 сакавіка 1869 г. у «секретной камере № 2 найдено: две формы деревянные для делания фальшивой монеты 20 коп. достоинства... ложка с металлическим сплавом, в холщёвой тряпке мелко истолчённый синий камень, комок какой-то мастики, нож для обрезывания монеты и семь подложных монет 20-ти коп. достоинства» [2, арк. 16–16 адв.].

Арыштант з гэтай камеры Нікадзім Мацвееў Жылевіч (43 гады) паведаміў, што сядзеўшыя з ім у камеры Мікалай Арлоў (ён жа Варапаеў, 40 гадоў) і Ігнацій Андрэеў (26 гадоў) уночы, закрыўшы акно падушкай, рабілі фальшывую манету. Аб гэтым Жылевіч хацеў расказаць, але спужаўся пагроз ад сакамернікаў.

Пры чарговым аглядзе 9 красавіка таго ж года ў кішэнях камізэлькі Мікалая Арлова знайшлі «три куска свинцового состава и две фальшивые 20-ти коп. достоинства монеты отделанные и шесть штук недоделанных... форма для литья этих монет....выброшенная в окно, а под нарами в камере ... жестянка и ножик с деревянным черенком» [2, арк. 16 адв. – 17].

Арлоў прызнаўся і дадаў, што ён «со скуки будет постоянно делать фальшивые монеты... что он два года уже занимается деланием фальшивой монеты в Минском туремным замке, и лет 16-ть тому назад он занимался этим делом, будучи на свободе» [2, арк. 17]. Ён таксама паведаміў, што «майстэрству» навучыўся ў Разані ў турэмным замку. У Мінскім жа замку яму ніхто не дапамагаў. Сплаў ён плавіў на лучынах і захоўваў на гарышчы ці ў спецыяльным месцы. Калі ён апынуўся ў адной камеры з Андрэевым, то перадаў свае навыкі і яму. Далей арыштант расказаў, што «выпустил такой монеты рублей на сто серебр[ом] 20-и копейками». Пастаўшчыкамі сыравіны Арлоў назваў хлебных падрадчыкаў, якія «платили яму от 5-ти до 7-ми рублей за каждые 50 монет» і збывалі іх сялянам пры пакупках хлеба [2, арк. 17 адв.].

Другі фігурант справы – былы радавы Тульскага пяхотнага палка Ігнацій Андрэеў прызнаў, што дапамагаў Арлову на працягу тыдня рабіць фальшывыя манеты. Набыццё неабходнай сыравіны (волава) і збыт гатовай прадукцыі адбываўся праз служачых турэмнага замка. Гэтую інфармацыю пацвердзіў і Нікадзім Жылевіч.

Праверка арыштантаў і хлебных падрадчыкаў, названых Каржанеўскім, паказала іх недатыкальнасць да гэтай справы. Да таго ж арыштант Ігнацій Андрэеў адмовіўся ў далейшым ад папярэдніх паказанняў і назваў іх проста ўласнымі здагадкамі.

Канчатковая пастанова суда вызначыла далейшы лёс абвінавачаных. Агавораных арыштантаў і хлебных падрадчыкаў, віна якіх не была пацверджана, «следует от всякой ответственности оставить свободными» [2, арк. 20 адв.]. Ігнація Андрэева і Мікалая Арлова (Варапаева), якія прызналі сваю віну, «за подделку монеты... подлежат лишению всех прав состояния и ссылке в каторжную работу в крепостях... на восемь лет, а по истечению срока работы....сослать в Сибирь навсегда» [2, арк. 21, 24 адв.].

Заключае справу паведамленне ў Мінскую Палату крымінальнага і цывільнага суда з Горнага дэпартамента аб тым, што «отправленные... 10 марта четырнадцать фальшивых монет 20 коп. достоинства, формы и материалы для делания оной в сем Департаменте получены и... препровождены на С. Петербургский Монетный Двор для уничтожения установленным порядком» [2, арк. 28].

У грашовым абарачэнні на тэрыторыі Беларусі XIX ст. прысутнічала пэўная колькасць фальшывых расійскіх манет. Абсалютная большасць іх зроблена шляхам ліцця ў форму, якая ў спрошчаным варыянце складалася з дзвюх паловак з выявамі аверса і рэверса падрабляемай манеты. Форму, як правіла, рыхтавалі з дрэва, гліны, гліняна-пясочнай сумесі, гіпсу, крэйды.

Заканадаўства Расійскай імперыі XIX ст. прадугледжвала для фальшываманетчыкаў скасаванне ўсіх правоў і катаржныя работы (ад 4 да 12 гадоў у залежнасці ад цяжкасці злачынства).

Такім чынам, аналізуючы гэтыя справы, можна зрабіць пэўныя высновы аб шырокім распаўсюджанні на беларускіх землях такіх з'яў, як вытворчасць і выкарыстанне фальшывых расійскіх манет, што неаднаразова адбывалася нават на тэрыторыі знакамітага Пішчалаўскага замка ў Мінску.

---

1. *Колабава, І. Н.* Падробка расійскай манеты ў Мінску ў першай палове XIX ст. / І. Н. Колабава // Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 510-годдзя атрымання Менскам магдэбургскага права) : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 4–5 верас. 2009 г. – Мінск : Беларус. навука, 2010. – С. 77–79.

2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 147. Воп. 4. Спр. 2227. Арк. 36.